

БЕЛТЭЛЕРАДЫЁКАМПАНІЯ АДЗНАЧЫЦЬ ЮБІЛЕЙ 5

ГІСТОРЫІ З ЖЫЦЦЯ ЧЫТАЧОЎ 13




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

2 ЖНІЎНЯ 2024 г. ПЯТНІЦА № 149 (30283)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй РЫБАКОЎ, старшыня канцэрна «Белнафтахім»:**

*«Сёння ў краіне выбудавана і паспяхова працуе ўстойлівая і цэнтралізавана кіраваная дзяржаўная сістэма нафтапрадуктазабеспячэння. Колькасць АЗС вырасла ў 2,5 раза, і сёння іх сетка налічвае 835 комплексаў. Патрэбы ўнутранага рынку ў аўтамабільным паліве задавальняюцца ў поўным аб'ёме. Цяпер актыўна вядзецца будаўніцтва электразарадных станцый, у тым ліку суперхуткіх зарадных комплексаў для электрамабіляў».*

# КАНТРАКТ НА АБАРОНУ РАДЗІМЫ



**Учора ў Ваенную акадэмію Рэспублікі Беларусь прыбылі юнакі і дзяўчаты, залічаныя на навучанне ў 2024 годзе. Курсантамі сталі 687 чалавек, з іх — 37 дзяўчат.**

**Мікіту ДАДЫЧЭНКУ са Жлобіна на вучобу праводзілі мама Юлія і бацька Мікалай. Яны прысутнічалі і пры падпісанні кантракта на навучанне ў Ваеннай Акадэміі і далейшае праходжанне службы. Хаця ў сям'і ніхто ў арміі не служыў, Мікіта з дзяцінства марыў стаць ваенным. Хлопец паступіў у Гомельскае кадэцкае вучылішча, якое паспяхова скончыў сёлета. У вучылішчы ён актыўна займаўся спортам, шмат чытаў, з цікавасцю асвойваў навучальныя прадметы. Спецыяльнасць навучання ў Ваеннай акадэміі «ідэалагічная работа ў падраздзяленнях Узброеных Сіл» Мікіта выбраў сам.**

**Віктар ІВАНЧЫКАЎ, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь павіншаваў асабовы склад і ветэранаў сіл спецыяльных аперацый Узброеных Сіл з прафесійным святам — Днём дэсантнікаў і сіл спецыяльных аперацый Узброеных Сіл.**
- Работнікаў і ветэранаў органаў Камітэта дзяржаўнага кантролю з 30-годдзем утварэння ведамства і прафесійным святам павіншаваў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.
- **Мінфін размясціў на БВФБ валютныя дзяржаблігацыі на $50 млн.**
- Тэмп росту экспарту беларускіх тавараў у студзені—чэрвені 2024 года склаў 104,2 працэнта, а прырост да ўзроўню мінулага года — $0,8 млрд.
- **За мінулыя 30 гадоў на «Полацк-Шкловалакне» павялічылі гадавы выпуск шклотканіны ў натуральным выражэнні ў 3,2 раза.**

Жніво-2024

# І НА МАШЫНЕ, І ЗА ШТУРВАЛАМ КАМБАЙНА

**І сярод камбайнераў, і сярод вадзіцеляў па перавозцы збожжа ёсць людзі, якімі трэба ганарыцца. На Гомельшчыне, нягледзячы на выпрабаванні стыхіяй і анамальнай спякотай, якая змянілася дажджамі і навальніцамі, аграрыі не збаўляюць узятых тэмпаў жніва. Усё больш гаспадарак можа пахваліцца «тысячнікамі». Камбайнераў і кіроўцаў, якія задаюць тэмпы ўборачнай, ушанавалі ў Лоеўскім раёне.**

СТАР. 3




Фота Лоеўскай раённай газеты «Лоеўскі край».

**Ягор ГУДКОЎСКІ — удзельнік рэспубліканскай акцыі БРСМ «Моладзь за ўраджай».**

У сезон

# ПРЫБРАЦЦА, ІДУЧЫ ПА ВЕДЫ

## Больш за 170 школьных кірмашоў пройдзе гэтым летам у Беларусі

**Лета яшчэ ў разгары, але 1 верасня ўсё бліжэй. А значыць, час падумаць аб набыцці школьнага адзення і іншых неабходных для вучобы рэчаў. Маштабныя распродажы тавараў для школьнікаў ва ўнівермагах па ўсёй Беларусі пачаліся яшчэ ў сярэдзіне ліпеня. А ў першыя жнівеньскія дні стартавалі традыцыйныя школьныя кірмашы, дзе гасцей чакае вялізны асартымент усяго, што неабходна для чарговага вераснёўскага старту ў Краіну ведаў.**

СТАР. 4



Фота БелТА.

ISSN 1990 — 763X

24149>

З першых вуснаў

# «НЯМА НА СВЕЦЕ СПРАВЫ БОЛЬШ ВЫСАКАРОДНАЙ, ЧЫМ ПРАЦА НА КАРЫСЦЬ СВАЁЙ КРАІНЫ»

**Кіраўніцтва спраў Прэзідэнта адзначае 30-гадовы юбілей. За гэты час орган дзяржаўнага кіравання прайшоў шлях ад невялікага падраздзялення, якое займалася матэрыяльна-тэхнічным і сацыяльна-бытавым забеспячэннем вышэйшых органаў дзяржаўнай улады, да буйнога шматгаліновага суб'екта гаспадарчай дзейнасці. Гэта стала магчымым дзякуючы самаадданай працы тысяч кампетэнтных людзей. Найлепшым з іх у гонар юбілею Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўручыў заслужаныя дзяржаўныя ўзнагароды.**

Як заўважыў кіраўнік дзяржавы, гэта асаблівая, нават унікальная цырымонія ўзнагароджання, паколькі на яе сабраліся прадстаўнікі аднаго вялікага згуртаванага калектыву — Кіраўніцтва спраў Прэзідэнта. Яно было створана 30 гадоў таму, літаральна праз месяц пасля першых у гісторыі суверэннай Беларусі прэзідэнцкіх выбараў. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што тады гэта было невялікае падраздзяленне, якое забяспечвала матэрыяльна-тэхнічнае суправаджэнне работы дзяржорганаў маладой незалежнай краіны. Некаторыя памылкова лічылі, што Кіраўніцтва спраў будзе займацца толькі вырашэннем бытавых пытанняў, звязаных з работай кіраўніка дзяржавы. Насамрэч у зоне адказнасці гэтай структуры шырокі спектр напрамкаў. «Гэта тысячы чалавек, якія не толькі кормяць, лечаць, але і вырабляюць прадукты харчавання. Гэта вялізнае міністэрства», — сказаў Прэзідэнт.

Цяпер на карысць нашай дзяржавы ў сістэме Кіраўніцтва спраў працуюць больш за 20 тысяч чалавек. Сярод іх — работнікі сфер ЖКГ, будаўніцтва, культуры, аховы здароўя, санаторыяў, гандлю, грамадскага харчавання, дыпсэрвісу, гасцініц. «Асобнаварта адзначыць працу шасці тысяч аграрыяў. Па многіх напрамках сельскагаспадарчай вытворчасці вы з'яўляецеся лідарамі ў краіне. Тысячы дабрачынных ініцыятыў і сацыяльна значных праектаў — заслуга супрацоўнікаў Дэпартамента па гуманітарнай дзейнасці», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Па словах беларускага лідара, надзвычай важна, што Кіраўніцтва спраў захоўвае наш нацыянальны здабытак, адказвае за сусветна вядомыя прыродныя брэнды Беларусі. «Белавежская пушча і іншыя нацыянальныя паркі, Бярэзінскі біясферны запаведнік, бязмежныя лясы з дзівосным раслінным і жывёльным светам, блакітныя азёры — не проста бясцэнны дар ад Бога і продкаў», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, як на світанку свайго прэзідэнцтва прымаў рашэнні, якія дазволілі захаваць гэты ўнікальны прыродны здабытак. У той няпросты час было нямала ахвотных, у тым ліку з іншых краін, якія хацелі выкарыстоўваць гэтыя землі ў сваіх карыслівых мэтах. Але рашэннем Прэзідэнта там быў наведзены парадак. «Там павінны быць нашы людзі, нашы суседзі, хто заўгодна, але адпачываць. Дзяліць запаведнікі і паркі было забаронена, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Гэта тое, што мы павінны былі і будзем перадаваць нашчадкам у першатворным выглядзе. А яшчэ трэба захаваць і перадаць ім унікальны культурны код, куды разам з роднай беларускай мовай уваходзяць народныя рамёствы. Іншых такіх на Зямлі няма і не будзе», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

Сёння ў канцэрне «Белмастацпромыслы», які знаходзіцца ў структуры Кіраўніцтва спраў, працуюць тысячы найталенавітых майстроў. «Усё гэта знікла б, калі б мы гэта не падабралі ў свой час. Гэта мне даводзілася прымаць рашэнне. Куды б я ні прыехаў, людзі мяне прасілі: «Дапамажыце, захавайце», — расказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама заўважыў, што амаль у кожнага майстра ёсць вучні. «Таму мы і нашы дзеці, як і шматлікія турысты, ведаем, як выглядаюць слувутыя слуцкія паясы, выцінанкі, вышыванкі, тканыя ручнікі, ганчарныя збаны. Мы не страцілі мастацтва пляцення з лазы і саломкі, роспісу па шкле, дрэве, тканіне», — звярнуў увагу беларускі лідар.

«Дарагія сябры! Я перакананы, што сённяшняя цырымонія стане для ўсіх новым стымулам працаваць яшчэ лепш. І працаваць вы будзеце яшчэ лепш, таму што няма на свеце справы больш высакароднай, чым праца на карысць сваёй краіны, нашай любімай Беларусі. Час выбраў нас, і выбраў, каб зрабіць яе яшчэ наймацнейшай і найпрыгажэйшай», — падкрэсліў беларускі лідар.

**Валерыя СЦЯЦКО.**



Фота БелТА.

## У тэму

### Вялікі гонар і адказнасць

Сваімі сакрэтамі прафесійнага майстэрства з журналістамі падзяліліся і героі дня. **Ляснічы Нацыянальнага парку «Браслаўскія азёры» Уладзімір ПРЭТКЕЛЬ,** які ўзнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», адзначыў, што забеспячэнне ўсім неабходным абсталяваннем паляпшаецца з году ў год. «Сёння ў нас ёсць усё, каб працаваць, захоўваць і памнажаць наша прыроднае багацце», — падзяліўся ён. Зараз у супрацоўнікаў Нацыянальнага парку гарачыя дні — турыстычны сезон. Браслаўскія азёры нязменна карыстаюцца цікавасцю і выклікаюць захапленне не толькі ў беларусаў, але і ў гасцей з іншых краін. «Некаторыя людзі ў шоку ад такога прыроднага багацця — нашых азёр, разнастайнасці відаў птушак, звяроў», — адзначае Уладзімір Прэткель.

**Наталля ЧЭЧЫК, загадчык адукацыйнага сімуляцыйнага цэнтра аддзела па навукова-адукацыйнай рабоце і міжнародных сувязях Рэспубліканскага клінічнага медыцынскага цэнтра,** якая таксама была ўзнагароджана медалём «За працоўныя заслугі», прызналася, што адчувае і гонар, і захапленне за краіну і яе народ. «Я адчуваю вялікую ўдзячнасць за тое, што атрымала такую высокую ўзнагароду. Я хацела б пажадаць усім маім калегам, нашым супрацоўнікам адчуць такія эмоцыі. Разам з тым гэта вялікая адказнасць. Наш Рэспубліканскі клінічны медыцынскі цэнтр заўжды задаваў тон, гэта надавала вялікую матывацыю працаваць лепш, каб быць лідарам і быць прыкладам. І, дзякуючы намаганням нашага кіраўніцтва, нашага калектыву, у нас гэта атрымліваецца. І ўсё наша жыццё прысвечана медыцыне», — адзначыла яна.

**Трактарыст-машыніст сельскагаспадарчай вытворчасці машыннага двара «Стараселле» ААТ «Александрыйскае» Віктар МІЛЬТО** стаў заслужаным работнікам сельскай гаспадаркі Беларусі. На яго ліку ўжо 47 уборачных кампаній. Афіцыйна працуе з 1978 года, а неафіцыйна — з сёмага класа, калі бацька прывёў летам папрацаваць памочнікам камбайнера. У гэтым сезоне працуе на нарыхтоўцы кармоў. «Памятаю часы, калі ў нас не было ні саляркі, ні грошай, нічога не было. А потым адбылася рэарганізацыя сельскай гаспадаркі, напрыклад, нашу гаспадарку ўзбуйнілі, паступіла новая тэхніка, тэхналогіі — ураджайнасць павысілася, умовы працы сталі лепшыя. Цяпер у нас, аграрыяў, ёсць усё, толькі працуй. А без сельскай гаспадаркі сёння немагчыма, усе хочуць есці. І мы адчуваем сваю адказнасць перад людзьмі. І вялікі дзякуй, што пра нас дзяржава не забывае», — адзначыў Віктар Мільто.

Парламенцкая дыпламатыя

**Ігар СЕРГЯЕНКА:**

# «ЁСЦЬ УСЕ ПЕРАДУМОВЫ ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ ЎЗАЕМНАГА ГАНДЛЮ»



**31 ліпеня 2024 года ў Тэгеране адбылася сустрэча Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ігара Сергяенкі з Прэзідэнтам Ісламскай Рэспублікі Іран Масудам Пезешкіанам, паведамляе прэс-служба Палаты прадстаўнікоў.**

Старшыня Палаты прадстаўнікоў перадаў Масуду Пезешкіану віншаванні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з уступленнем на пасаду і запрашэнне наведаць нашу краіну з афіцыйным візітам у любы зручны для яго час.

«Беларусь надзейны і даўні партнёр Ірана, — падкрэсліў старшыня Палаты прадстаўнікоў. — У нас ёсць больш чым 30-гадовы вопыт дыпламатычных адносін. Мы падзяляем агульныя прынцыпы, такія як імкненне да пабудовы шматпалярнага свету, непахіснасць дзяржаўнага суверэнітэту, неўмяшанне ва ўнутраныя справы, раўнапраўнае ўзаемадзеянне».

Ігар Сергяенка праінфармаваў Масуда Пезешкіана аб атрыманні Рэспублікай Беларусь статусу паўнапраўнага члена ШАС.

«Далейшаму ўмацаванню шматбаковага і двухбаковага палітычнага ўзаемадзеяння на карысць нашых народаў паслужыць рэалізацыя Дарожнай карты ўсебаковага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Іранам на 2023—2026 гады, падпісанай у ходзе візіту Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у сакавіку мінулага года ў Тэгеран», — адзначыў Ігар Сергяенка.

Паводле слоў старшыні Палаты прадстаўнікоў, ёсць усе перадумовы для таго, каб яшчэ больш інтэнсіўна развіваць узаемны гандаль. «Рэспубліка Беларусь гатова пастаўляць па выгадных коштах прадукцыю сусветнай якасці, у тым ліку мяса птушкі і ялавічыны, сухое малако, сельскагаспадарчую, грузавую, кар'ерную і аўтобусную тэхніку. У Ірана таксама ёсць тавары, якія карыстаюцца попытам на беларускім рынку». У сувязі з гэтым бакі закранулі пытанне аб прадаўжэнні дзейнасці Змешанай беларуска-іранскай камісіі па пытаннях эканамічнага супрацоўніцтва.

«Як адзін са значных фактараў, якія садзейнічаюць пашырэнню беларуска-іранскага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, мы разглядаем Пагадненне аб свабодным гандлі паміж Еўразійскім эканамічным саюзам і Іранам», — адзначыў старшыня Палаты прадстаўнікоў і праінфармаваў Прэзідэнта Ірана аб тым, што наша краіна ратыфікавала гэтае пагадненне.

На сустрэчы таксама была падкрэслена важнасць развіцця гуманітарнага супрацоўніцтва. «Навука, адукацыя і ахова здароўя дапамагаюць усталёўваць прамыя сувязі. Народная дыпламатыя заўсёды была і застаецца важным рэсурсам для ўмацавання дружбы і ўзаемаразумення паміж нашымі народамі», — сказаў Ігар Сергяенка.

Як паведамлялася, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па даручэнні Прэзідэнта краіны здзейсніў працоўны візіт у Тэгеран, дзе разам са старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Сяргеем Рачковым і Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Іране Дзмітрыем Кальцовым узяў удзел у цырымоніі інагурацыі выбранага Прэзідэнта Ісламскай Рэспублікі Іран Масуда Пезешкіана. У ходзе візіту адбылася таксама сустрэча старшыні Палаты прадстаўнікоў Ігара Сергяенкі са Старшынёй Сходу Ісламскага савета Ірана Махамадам — Багерам Галібафам і шэраг сустрэч з кіраўнікамі міжнародных арганізацый.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# І НА МАШЫНЕ, І ЗА ШТУРВАЛАМ КАМБАЙНА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Запаветны рубеж першымі пераадолелі хлебаробы ААТ «Ураджайны». У гэтай гаспадарцы кіроўца-тысячнік — Сяргей Лёля, а экіпаж-тысячнік па намалоце — тандэм Сяргея Давыдоўскага і яго памочніка Івана Пікаса. Не адстаў па тэмпах жніва ў гэтай гаспадарцы і экіпаж Аляксея Макеенкі і Івана Цеснаўца. Прыйшла добрая навіна і з ААТ «Каўпень-Агра» Лоеўскага раёна. **Кіроўца Ягор ГУДКОЎСКІ** перавёз запаветную тысячу тон зерня. Малады працаўнік, удзельнік рэспубліканскай акцыі БРСМ «Моладзь за ўраджай» прымаў віншаванні прама ў полі. Карэспандэнт «Звязды» асабіста пераканалася, што для кіроўца-тысячніка шчыраваць на зямлі — гэта сямейнае. Гудкоўскія ў гаспадарцы — моцная працоўная каманда.



**Старшыня Лоеўскага раённага Савета дэпутатаў, лідар Лоеўскай раённай арганізацыі Беларускай партыі «Белая Русь» Ірына ПАСТУХОВА павіншавала кіроўцу-тысячніка на адвозцы зерня ААТ «Каўпень-Агра» Ягора ГУДКОЎСКАГА.**

## ДРУГАЯ СТУЖКА «ТЫСЯЧНІКА» Ў КАПІЛЦЫ

Кіроўца Ягор Гудкоўскі ў «Каўпень-Агра» працуе ўжо дванаццаты год. Раней — на трактарах і камбайнах, і вось другі сезон за рулём МАЗа перавозіць збожжа.

— У дзень восем-дзевяць рэйсаў выходзіць. Працаваць прывычны, — ёмка і коратка аб рабоце ў цяперашнюю пару гаворыць Ягор.

Ён першы ў сваёй гаспадарцы перавёз тысячу тон збожжа новага ўраджаю. Паўтарыў леташні поспех. Што такое перажываць рытм гарачай уборачнай пары, Ягор добра ведае з дзяцінства. Сын механізатара, ён у кабіне камбайна — з сярэдніх класаў школы. Як толькі дазволіў узрост, працаваў памочнікам камбайнера ў экіпажы бацькі.

Поспехі кіроўцы ААТ «Каўпень-Агра» ў рабоце заўважныя ў раёне. Павіншаваць маладога аграрыя ў поле прыехалі **старшыня Лоеўскага раённага Савета дэпутатаў, лідар Лоеўскай раённай арганізацыі Беларускай партыі «Белая Русь» Ірына ПАСТУХОВА,** першы сакратар раённай арганізацыі БРСМ Святлана Пятрэнка і старшыня Каўпеньскага сельвыканкама Людміла Прымак.

— Узнагароджанне перадавікоў — добрая традыцыя на Лоеўшчыне. Нялёгкая, напружаная праца, дасягненні працаўнікоў — своеасаблівы маяк, прыклад для іншых аграрыяў, — падзякавала Ягору Гудкоўскаму за ўзорную працу Ірына Пастухова.

## ВЫСОКАЯ ПЛАНКА

Сам малады працаўнік падзяліўся, што яму важна выкладвацца па поўнай. Ёсць з каго браць прыклад. Ужо каля трыццаці гадоў у роднай гаспадарцы годна працуе галава сям'і — **Віктар Ягоравіч ГУДКОЎСКІ.** Ён быў механізатарам не адзін дзясятак гадоў. Па стане здароўя рабіў паўзу ў рабоце за штурвалам камбайна, працаваў кіроўцам. Але вярнуўся і апошнія гады зноў у перадавіках на жніве. Сёння на ўборачнай правая рука бацькі, старшага камбайнера Віктара Ягоравіча Гудкоўскага, — малодшы сын Дзмітрый. Хлопцу 22 гады. І ён першым з вялікай сям'і вырашыў паступаць у ВНУ, але гаспадарку і родных у вёсцы не пакінуў. Пасля школы Дзмітрый Гудкоўскі паступіў у Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. В. Сухога. Але хутка па прызыве пайшоў у армію, дзе служыў на грузавой машыне. Пасля службы вясковы хлопец перавёўся ў Гомельскі дзяржуніверсітэт імя Ф. Скарыны. Цяпер вучыцца завочна па спецыяльнасці «інжынер-праграміст», а працуе ў роднай гаспадарцы ААТ «Каўпень-Агра» інжынерам па ахове працы. Дзмітрый Гудкоўскі першы сезон дапамагае камбайнеру ў экіпажы бацькі. Падтрымлівае маральна сваіх мужчын жонка і маці Алія Камілеўна Гудкоўская.

Яна таксама працуе ў гаспадарцы — аператарам машыннага даення. Калісьці на жніве жанчына сама была памочнікам механізатара. Выходзіла ў поле з мужам.

## РАБОТА КІПІЦЬ

Трыцікале, гарох, ячмень, пшаніца... Розныя культуры ўжо давялося ўбіраць з поля экіпажам Гудкоўскіх. Бацька і сын набралі добрую хуткасць на жніве.

— Азімую пшаніцу ўжо ўбралі поўнасцю, перайшлі да ўборкі яравога аўса і трыцікале, — тлумачаць працаўнікі. — Паўзы ў рабоце мінімальныя. Абедаем у полі, усё добра, толькі старайся. За дзень у залежнасці ад таго, на які ўчастак выходзім, — да пяцідзесяці тон убіраем.

Экіпаж працуе на камбайне, для якога гэта толькі другое жніво. Што значыць беражлівыя адносіны да кожнага зярнятка і да сваёй «баявой машыны», Гудкоўскім тлумачыць не трэба.

— Вельмі важна берагчы тэхніку, шкадаваць яе. Робім абавязковы агляд: і перад выхадам раніцай, і на працягу дня, — адзначае Віктар Гудкоўскі.

Калі паспрыяе надвор'е, «тысячу» тон намалочанага збожжа гэты экіпаж плануе запісаць на свой рахунак ужо пасля выхадных, на наступным тыдні.

## ФІНІШУЮЦЬ НА ЖНІВЕ

Між тым у цэлым па вобласці аграрыі Гомельшчыны ўпэўнена набліжаюцца да фінішнай прамой. Паводле аператыўнай інфармацыі, на раніцу 1 жніўня ў рэгіёне зерневыя і зернебабовыя культуры ўбраны на плошчы 229,1 тысячы гектараў. Гэта 73 працэнты ад плана. Валавы збор у бункернай вазе склаў 462,5 тысячы тон. Па тэмпах уборкі ўпэўнена лідзіруе Жыткавіцкі раён, дзе ўбрана 93 працэнты плошчаў. Не адстае і Брагіншчына, аграрыі якой убралі з палёў 90 працэнтаў ад плана. Гаспадаркамі Добрушскага раёна — 85 працэнтаў ад запланаванага. Такі ж паказчык і ў аграрыяў Акцябрскага раёна.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота Лоеўскай раённай газеты «Лоеўскі край».**



**Экіпаж старшага камбайнера ААТ «Каўпень-Агра» Віктара ГУДКОЎСКАГА і памочніка Дзмітрыя ГУДКОЎСКАГА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Вялікабрытанія ўпершыню выбыла з дзясяткі вядучых прамысловых краін




Злучанае Каралеўства ўпершыню не трапіла ў топ-10 рэйтынга краін па ўзроўні прамысловай вытворчасці, паведаміла газета The Times. Выданне адзначыла, што ў апошнім рэйтынгу за 2022 год Вялікабрытанія апусцілася на 12-е месца, хоць за год да гэтага займала восьмую пазіцыю. У галіновай брытанскай арганізацыі Make UK у сувязі з гэтым заявілі, што краіна мае патрэбу ў «доўгатэрміновай прамысловай стратэгіі» для падтрымкі галіны. «Мы глыбока расчараваны тым, што Вялікабрытанія ўпершыню выбывае з дзясяткі найбуйнейшых краін-вытворцаў у свеце», — заўважыў прадстаўнік арганізацыі. Паводле яго слоў, гэта адлюстроўвае «канкрэтныя фактары і тэндэнцыі, якія мяняюць абрысы сусветнай эканомікі». Злучанае Каралеўства ў рэйтынгу абагналі Мексіка і Расія, якія ўзняліся адпаведна на сёмае і восьмае месцы. Першае месца заняў Кітай, за ім ідуць ЗША.

## Эканоміка КНДР вярнулася да росту

Рост валавога ўнутранага прадукту КНДР па выніках мінулага года склаў 3,1 працэнта, што з'яўляецца рэкордным паказчыкам за апошнія сем гадоў (з 2016-га). Такую ацэнку прадставіў Банк Карэі (цэнтрабанк Рэспублікі Карэя), паведаміла Reuters. Такім чынам, эканоміка Паўночнай Карэі вярнулася да росту, заключае паўднёвакарэйскі рэгулятар. Паводле яго ацэнак, пазітыўная дынаміка ў КНДР стала вынікам росту ў сельскай гаспадарцы, прамысловасці, будаўніцтве і сферы паслуг. Пры гэтым аб'ём знешняга гандлю КНДР летась павялічыўся амаль на 75 працэнтаў — да $2,77 млрд супраць $1,59 млрд годам раней. Экспарт вырас на 104 працэнты — да $330 млн. «Ёсць пазітыўныя фактары, такія як магчымасць далейшага росту гандлю з Кітаем і пашырэнне эканамічнага супрацоўніцтва з Расіяй», — паведаміў прадстаўнік паўднёвакарэйскага рэгулятара.



## У Тайландзе пачалася рэалізацыя праграмы «Лічбавы кашалёк»



Пра гэта заявіў тайландскі прэм'ер-міністр Сетха Тхавісін на сваёй старонцы ў сацсетцы, паведаміла ТАСС. У грамадзян краіны ёсць магчымасць атрымаць па 10 тысяч батаў (каля $280) у нацыянальнай лічбавай валюце, пры гэтым агульныя выдаткі складуць $14 млрд. Для атрымання лічбавых грошай карыстальнікам смартфонаў трэба ўстанавіць спецыяльны дадатак, у якім «неабходна зарэгістравацца да 15 верасня». Па словах прэс-сакратара тайландскага ўрада Чая Вачаронга, каля 50 мільёнаў жыхароў краіны адпавядаюць крытэрыям для ўдзелу ў праграме. Сродкі можна патрацідь толькі ў радыусе чатырох кіламетраў ад дома па месцы жыхарства на працягу шасці месяцаў з моманту атрымання. Як чакаецца, грошы паступяць на рахунак удзельнікаў праграмы ў чацвёртым квартале гэтага года. Урад Тайланда разглядае «Лічбавы кашалёк» у якасці меры стымулявання эканомікі, садзейнічання грашоваму абарачэнню ў кожным рэгіёне краіны і аказання дапамогі ўразлівым групам насельніцтва.

# ПРЫБРАЦЦА, ІДУЧЫ ПА ВЕДЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па добрай традыцыі, вакол сезонных школьных распродажаў у розных крамах прыдуманы сімпатычныя актыўнасці для школьнікаў і іх бацькоў: паказы школьных калекцый, інтэрактыўныя гульні, віктарыны з уручэннем падарункаў, розыгрышы прызоў. Ёсць і скідкі, і бясплатныя паслугі — напрыклад, з 1 па 31 жніўня бясплатная дробная «падгонка» швейных вырабаў сукенкава-касцюмнага асартыменту прапануецца ў сталічных універмагах «Беларусь», «ЦУМ Мінск» і ГД «На Нямізе».



Фота БелТА.

## Модныя дзэткі

Новыя школьныя калекцыі рыхтаваліся яшчэ з мінулай восені, расказала **старшыня канцэрна «Беллегпрам» Таццяна ЛУГІНА.**

— У 2024-25 навучальны год уваходзім з новымі напрацоўкамі: каля 300 мадэляў былі распрацаваны для дзяцей, — распавяла яна. — У цэлым каля мільёна ста вырабаў мы падрыхтавалі да гэтага гандлёвага сезону, і 65-70 % ужо знаходзяцца на паліцах крам.

Трэнд апошніх гадоў у дзіцячым і падлеткавым адзенні (гэта паказваюць пікі продажаў) — мадэлі з трыкатажу або камбінаваныя, дзе выкарыстаны як трыкатажныя, так і тэкстыльныя палотны, дадала Таццяна Лугіна. Што да моды, то сёння ў дзяцей і падлеткаў вельмі папулярныя бомберы замест класічных пінжакоў.

— Таму бомберы сістэмна ўвайшлі ў нашы новыя калекцыі, — падкрэсліла яна.

Акрамя фірменных магазінаў, новыя калекцыі ад брэндаў «Беллегпрама» можна набыць ва ўсіх універмагах і гандлёвых сетках краіны. Асаблівая ўвага сёлета ўдзяляецца рэалізацыі школьных калекцый у сістэме «Белкаапсаюз», расказала Таццяна Лугіна, каб у невялікіх населеных пунктах у пакупніка таксама быў шырокі выбар па кожным элеменце школьнага адзення. Продажы ажыццяўляюцца і праз інтэрнэт-гандаль. Акрамя таго, новыя калекцыі «Беллегпрама» можна набыць на школьных кірмашах, дзе бацькі могуць хутка і зручна знайсці ўсё неабходнае для сваіх школьнікаў. Так, з 27 ліпеня па 5 верасня такі кірмаш праходзіць у Гродне, 10 жніўня — пачнецца ў Маладзечне, а 16 жніўня — у Баранавічах. На 17 жніўня запланаваны школьны кірмаш у Шаркаўшчыне, Слуцку, Салігорску, на 18-е — у Шчучыне і Лоеве, на 24-е — у Жодзіна і аграгарадку Лясны, расказала **начальнік упраўлення ўнутранага гандлю і выставачнай дзейнасці Канцэрна «Беллегпрам» Вольга ГРАБЕНЯ.**

— Мы разумеем, што мода для малодшых школьнікаў, сярэдніх класаў і падлеткаў моцна адрозніваецца, — падкрэсліла Таццяна Лугіна.

Таму ў калекцыях прадпрыемстваў «Беллегпрама» — вельмі розныя лукі, нават калі яны выкананы ў адной каляровай гаме: а як правіла, для школьнага адзення найбольш папулярнай застаецца сіняя палітра.

У новых школьных калекцыях — вялікая колькасць сарафанаў рознай канструкцыі і даўжыні, розных фасонаў блузкі і вадалазкі па дэмакратычнай цане. Напрыклад, вадалазка са здымнымі аздобнымі элементамі (карункамі) абыдзецца бацькам у 35-40 рублёў. У асартыменце — самыя розныя фасоны штаноў для дзяўчынак і хлопчыкаў, ад класічных і завужаных да модных цяпер палаца. Папулярныя ў апошнія гады спадніцы-сонца і спадніцы-клёш, а таксама з плісэ ці складкамі рознай шырыні. Усё гэта ёсць на паліцах магазінаў, рэзюмавала Таццяна Лугіна. Больш за тое, калі ў дзіцяці ёсць індывідуальныя асаблівасці фігуры (так званыя «нестандартныя памеры»), прадпрыемствы канцэрна «Беллегпрам» могуць прыняць заказ і пашыць мадэль для канкрэтнага школьніка.

— Распрацоўваючы калекцыі для розных узростаў, дызайнеры ўлічвалі і асаблівасці целасклада дзяцей, і, вядома ж, іх рухомасць, — дадала Таццяна Лугіна.

Таму пільная ўвага ўдзялялася тканінам, з якіх выраблялася школьнае адзенне.

— Шырока прадстаўлены тканіны ад «Камволь», дзе да 30% воўны, а таксама вялікая колькасць вырабаў у полівіскозных тканінах і трыкатаж (а гэта баваўна, баваўняна-поліэфірныя ніткі), — звярнула ўвагу яна.

Пры выбары тканін значэнне было нададзена іх паветрапранікальнасці, гіграскапічнасці і зносаўстойлівасці, бо школьнае адзенне дзятва і падлеткі носяць штодня. А каб была магчымасць выглядаць разнастайна, прадугледжана вялікая колькасць здымных элементаў.

І яшчэ адзін важны нюанс:

— Мы ўлічылі вопыт мінулых гадоў, і ў калекцыях прысутнічаюць мадэлі штаноў і спадніц з рэгуляванай таліяй.

Прадугледжана і магчымасць для мам лёгка «адпусціць даўжыню» вырабу. Калі за год дзеці падрастаюць, іх школьнае адзенне можа «падрасці» разам з імі.

— І вельмі важны крытэрый пры распрацоўцы нашых калекцый і запуску іх у вытворчасць — цэнаўтварэнне, — сказала Таццяна Лугіна. — Бацькі павінны прыйсці ў краму і знайсці для сваіх школьнікаў не толькі прыгожыя і зручныя рэчы, але і прымальныя па цане. Вялікую ўвагу ўдзяляем і гандлёвай надбаўцы. Нягледзячы на тое, што фірменныя крамы нашых прадпрыемстваў вызвалены ад рэгулявання гандлёвай надбаўкі, мы палічылі неабходным парэкамендаваць стрымліваць яе для школьнага асартыменту ў памеры 30 %.

## Колькі «каштуе» школьнік?

Таварныя секцыі ўжо аформлены ва ўсіх магазінах краіны. Ёсць асобныя зоны «Для першакласніка». А агульная колькасць школьных кірмашоў перавысіць 170, сказала **начальнік упраўлення арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Наталля МЕЛЬНІКАВА.**

— Уся інфармацыя аб правядзенні такіх мерапрыемстваў ёсць на сайтах гандлёвых аб'ектаў, аблвыканкамаў, Мінгарвыканкама, гар- і райвыканкамаў, — адзначыла яна.

Сёлета арыенціровачны сярэдні кошт камплектаў адзення дзелавога стылю і абутку для школьнікаў складае ад 120 да 620 рублёў, расказала спецыяліст. Прыкладны кошт адзення і абутку для малодшых класаў — ад 120 да 600 рублёў, для сярэдніх класаў — ад 180 да 580 рублёў, бацькам старшакласнікаў давядзецца выкласці ад 170 да 620 рублёў, падлічылі ў МАРГ. Арыенціровачны кошт аптымальнага набору школьна-пісьмовых і канцылярскіх прылад складзе да 270 рублёў для малодшых класаў і да 260 рублёў для старшакласнікаў.

Танней ці даражэй — выбіраць бацькам. Выбар ёсць, і гэта галоўнае.

Сёння гандаль прапануе школьнікам каля 180 мадэляў адзення дзелавога стылю для дзяўчынак і дзяўчат-старшакласніц, і крыху менш — каля 160 — мадэляў для хлопчыкаў і юнакоў. А таксама больш за сотню мадэляў заплечнікаў, школьных сумак і ранцаў, шырокі асартымент абутку і канцылярскіх прылад. Прычым на 90 % (па Мінску — на 95 %) пакупніцкі попыт у адзенні для навучэнцаў забяспечаны айчынным вытворцам. 75 % трыкатажу ў школьных секцыях — таксама беларускай вытворчасці, як і 50 % абутку. Найбольш запатрабаванымі гэтым летам сталі калекцыі «Калінкі» і «Славянкі», а таксама «Надэкс», Жлобінскай швейнай фабрыкі, «БелКрэда», «Палесся», «Світанка», «8 Сакавіка», «Купалінкі», «Галантэі» і г. д.

— Устаноўлены гранічныя гандлёвыя надбаўкі на адзенне для дзяцей, — распавяла Наталля Мельнікава. — Для імпарцёраў гэта 40 %, як і для айчынных вытворцаў.

На дзіцячы абутак такая надбаўка складае 30 % для імпарцёраў і 40 % — для айчынных вытворцаў, на пісьмовыя і канцылярскія прылады, адпаведна, 20 і 30 %, на заплечнікі і ранцы вучнёўскія — 30 % для беларускіх і замежных тавараў.

— У сярэднім у крамах памер гандлёвай надбаўкі на школьны асартымент з улікам акцый і скідак складае прыкладна 23 %, — адзначыла прадстаўнік МАРГ.

Па рэгіёнах сума, якую бацькам трэба будзе выдаткаваць на «набор школьніка», вар'іруецца.

— Сёння танней абыходзіцца школьная «экіпіроўка» ў рэгіёнах з меншай колькасцю насельніцтва, — сказала спецыяліст. — У Мінску і сталічнай вобласці цэны вышэйшыя.

У сталіцы арыенціровачны кошт аптымальнай «экіпіроўкі» для малодшых класаў — 320—1200 рублёў, для старэйшых класаў — 390—1300 рублёў, адзначыла **намеснік генеральнага дырэктара прадпрыемства «Сталічны гандаль і паслугі» Алена ЦАРЫКАВА.**

— Кошт школьнай экіпіроўкі ў бягучым годзе ў параўнанні з мінулымі гадамі, з улікам пастановы № 713 «Аб рэгуляванні цэн», знізіўся па асобных катэгорыях на 4—14 %, — дадала яна.

Для зніжэння цэнавай нагрузкі на пакупніцу ў крамах на пастаяннай аснове праводзяцца сумесныя з вытворцамі і пастаўшчыкамі мерапрыемствы па продажы тавараў са скідкамі, адзначыла Наталля Мельнікава. Прапануюцца праграмы крэдытавання і растэрміноўкі як за кошт уласных сродкаў гандлю, так і за кошт сродкаў вытворцы. Ёсць магчымасць скарыстацца банкаўскімі картамі растэрміноўкі (Халва, Магніт, Картафан). Набыць тавары для школьнікаў у гандлёвых аб'ектах можна з прыцягненнем банкаўскіх крэдытаў на некалькі месяцаў. І, вядома, універмагі і гандлёвыя цэнтры праводзяць акцыі са скідкамі ад 15 да 30 %. Напрыклад, такія мерапрыемствы запланаваны прадпрыемствамі Спажыўкааперацыі (зніжка ад 5 да 15 %). А школьныя калекцыі мінулых гадоў у шэрагу магазінаў краіны можна набыць на скідцы да 50 %.

Акрамя таго, у шэрагу ўнівермагаў прадугледжаны дысконтныя карты, а для аказання адраснай сацыяльнай дапамогі (шматдзетным сем'ям і сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў) пры прад'яўленні пацвярджаючых дакументаў можна атрымаць дадатковую зніжку на школьны асартымент.

Прадбачлівыя бацькі ўжо, не спяшаючыся, купляюць усё да школы, але самая гарачая пара ў аддзелах для школьнікаў пачнецца, зразумела, у канцы жніўня. Прадстаўнікі гандлю запэўнілі: усім усяго хопіць. З 1 жніўня МАРГ пачаў шырокамаштабныя маніторынгі арганізацый гандлю па наяўнасці тавараў школьнага асартыменту. Акрамя таго, увесь жнівень спецыялісты Міністэрства гандлю будуць аналізаваць і рознічныя кошты на школьныя тавары.

## Да пытання аб форме

Не забыўся гандаль і аб асартыменце швейных вырабаў, якія школы і гімназіі абралі ў якасці абавязковых — то-бок элементаў школьнай формы (часцей за ўсё гэта камізэлькі і жакеты). Адпаведныя заяўкі гандлю павялічаны.

— У 2024-25 навучальным годзе Міністэрствам адукацыі прынята рашэнне аб замацаванні тых падыходаў да школьнай формы, якія былі выбраны раней, — паведаміла **кансультант упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Галоўнага ўпраўлення агульнай сярэдняй і дашкольнай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Ірына БУЛАЎКІНА.** — Кожная ўстанова адукацыі працягне працу па паэтапным пераходзе да школьнай формы.

Ну, а каб бацькі не разгубіліся і не забыліся набыць усё, што трэба да 1 верасня, на сайце Мінадукацыі адкрыта рубрыка «Падрыхтоўка да новага навучальнага года», дзе размешчаны прыкладны пералік асноўных пакупак да школы. Акрамя таго, у Міністэрстве адукацыі ў сувязі з чарговай кампаніяй па зборы дзяцей да новага навучальнага года працуе гарачая лінія.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА КРОЧЫЦЬ ПА КІТАІ

## Граматамі СПБ узнагароджаны кітайскія перакладчыкі

**У апошні час даволі стабільна і актыўна развіваюцца беларуска-кітайскія літаратурныя стасункі. У многім гэта адбываецца дзякуючы намаганням Саюза пісьменнікаў Беларусі і яго партнёраў у Кітаі — у прыватнасці, Цэнтра даследаванняў Беларусі Усходне-Кітайскага педагагічнага ўніверсітэта ў Шанхаі і Другога Пекінскага ўніверсітэта замежных моў. Партнёры беларускай пісьменніцкай супольнасці ў Паднябеснай прыкладваюць самыя актыўныя намаганні для пашырэння беларускага мастацкага слова ў кітайскіх медыя на розных платформах — друкаваных і лічбавых, а таксама спрыяюць выданню ў Кітаі кніг беларускіх літаратараў.**

Напрыканцы 2022 года пабачыў свет зборнік анталагічнага характару, дзе былі прадстаўлены творы дзевяці беларускіх паэтаў і празаікаў. Ініцыятар нараджэння гэтага праекта — доктар філалагічных навук, прафесар Другога Пекінскага ўніверсітэта замежных моў Чжан Хуэйцінь. Яна выступіла ў гэтым выданні і як перакладчык. Следам у Пекіне выйшла асобная кніга паэзіі і прозы Алеся Бадака. Перакладчыкам з'яўляецца дэкан філалагічнага факультэта Другога Пекінскага ўніверсітэта замежных моў Хань Сяае. Падрыхтаваны новыя выданні твораў беларускіх аўтараў, якія неўзабаве пабачаць свет.

Да працы пекінскіх літаратараў па прасоўванні ў Кітаі беларускай прозы і паэзіі далучыўся і кіраўнік Цэнтра даследаванняў Беларусі Усходне-Кітайскага педагагічнага ўніверсітэта ў Шанхаі Бэй Вэньлі. Спраектаваны новыя ініцыятывы па развіцці кантактаў беларускага боку з перакладчыкамі і кніжнымі выдавецтвамі Шанхая — аднаго з буйнейшых цэнтраў кніжнай культуры Паднябеснай. Як вядома, у Шанхаі правёў частку свайго жыцця легендарны Лу Сінь (1881—1936). Дарэчы, ён з'яўляецца перакладчыкам і твораў ураджэнца беларускай зямлі — класіка польскай паэзіі Адама Міцкевіча. У 1956 годзе ў Мінску пабачыла свет кніга «Апавяданні» Лу Сіня ў перакладзе на беларускую мову Льва Салаўя. Народны мастак СССР Заір Азгур выканаў бюст пісьменніка Лу Сіня.

За прапаганду беларускай літаратуры ў Кітаі Чжан Хуэйцінь і Бэй Вэньлі адзначаны граматамі Саюза пісьменнікаў Беларусі.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

Сядзі і глядзі

# ВЫБАР НА КАРЫСЦЬ САБЕ



**У эфіры тэлеканала «Расія-Культура» ў бліжэйшыя выхадныя для самай рознай аўдыторыі ёсць цікавыя прапановы. Гэта дазволіць як згадаць знакамітыя мастацкія фільмы, так і абавязкова даведацца штосьці новае.**

Напрыклад, у суботу з нагоды 100 гадоў з дня нараджэння пісьменніка Анатолія Алексіна тут пакажуць мастацкі фільм «Расклад на заўтра» (Экран, 1976 г.), дзе юбіляр выступіў аўтарам сцэнарыя. Кінастужка, знятая рэжысёрам Мікалаем Александровічам, складаецца з трох невялікіх лірычных гісторый, цэнтральнымі героямі якіх з'яўляюцца трое сяброў. Ім даводзіцца пражываць па сюжэце сваё сталенне, вырашаць няпростыя жыццёвыя дылемы, але пры гэтым рабіць выбар на карысць дабра, сяброўства і сумлення...

А ў панядзелак 5 жніўня спаўняецца 180 гадоў з дня нараджэння Ільі Рэпіна, вялікага рускага мастака, работы якога добра вядомыя не толькі аматарам жывапісу, але і нават тым, хто рэдка зазірае ў залы мастацкіх галерэй. Напярэдадні прыгожай даты на тэлеканале «Расія-Культура» ў нядзелю 4 жніўня ўвазе гледачоў прадставяць дакументальную кінастужку «Ілья Рэпін. Таямніцы вядомых палотнаў». На першы погляд, сюжэты яго карцін зразумелыя, але калі прыгледзецца, то можна адкрыць для сябе шмат новага. Фільм раскажа пра схаваныя сэнсы, якія мастак закладваў у свае палотны, пра загадкі і парадоксы, якія заўважаеш не з першага позірку. Адна з такіх карцін «Пастаноўка натуры ў майстэрні І. Я. Рэпіна ў Акадэміі мастацтваў», якая не вядомая шырокай аўдыторыі. А вось «Бурлакі на Волзе», «Запарожцы пішуць ліст турэцкаму султану» і шэраг іншых работ мастака наадварот добра многім вядомыя. Калі вам цікава, як працаваў Рэпін над кожнай з гэтых карцін, як складваўся лёс яго мадэляў і ў чым ён бачыў таямніцу творчасці, то абавязкова паглядзіце дакументальны фільм у нядзелю.

**Алена ДРАПКО.**

# ШАШКІ

(«Звязда») Выпуск № 223

№ 114



З 13 да 14 ліпеня ў Стоўбцах праходзіў рэспубліканскі турнір па шашках-64 «Дружба». Перамог кандыдат у майстры Мар'ян Пякарскі (Мінск). З 15 да 19 ліпеня ў аг. Жыровічы (Слонімскі раён) праходзіў XIV Рэспубліканскі турнір па шашках-100, прысвечаны Дню вызвалення Слоніма. Перамог майстар Уладзіслаў Фейгін (Гомель).

Сённяшнія дамачныя кампазіцыі складзеныя вядучым рубрыкі.

**№ 114**

**Белыя простыя:** c1, b2, g5, дамкі h6, g1 (5)

**Чорныя простыя:** c3, e3, g3, d4, f4, d6 (6)

**№ 115**

**Белыя простыя:** h2, g5, f6, дамка h6 (4)

**Чорныя простыя:** c3, e3, g3, d4, f4, a5, f8 (7)

**№ 116**

**Белыя простыя:** g5, d6, h6, дамка h2 (4)

**Чорныя простыя:** e3, g3, b4, f4, e5, b6, f8 (7)

**№ 117**

**Белыя простыя:** b2, c3, b4, h4, b6, дамка c1 (6)

**Чорныя простыя:** a3, d4, e5, d6, h6, a7 (6)

Астатнія кампазіцыі складзеныя па правілах бразільскіх шашак.

**№ 118**

**Белыя простыя:** a1, d2, f2, e3, c5, b6, h6 (7)

**Чорныя простыя:** h4, e5, a7, e7, дамка a3 (5)

**№ 119**

**Белыя простыя** шашкі: d2, f2, b4, c5, b6, дамка g1 (6)

**Чорныя простыя** шашкі: a3, c3, f4, h4, g5, e7, g7 (7)

**№ 120**

**Белыя простыя шашкі:** b2, d2, f4, дамка g1 (4)

**Чорныя простыя шашкі:** f2, e3, h6, дамкі e7, g7 (5)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выігрываюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні.

Выпуск № 222 ад 19.07.2024.

№ 107 de3, e7, e1(g1, d4) f2, a7(h2) b8x.

№ 108 1. d6-c7 b8:b4 2. d4-e5 f4:d6 3. h2:f4 e3:g5 4. g1:e7 f8:d6 5. h6:a3 g5-f4 6. a3-c1 a5-b4 7. c1:g5 b4-c3 8. g5-c1 h8-g7 9. h4-g5+

№ 109 1. ed4 c:e3 2. f:d4 ef4 3. ab6 fg3 4. ba7 gf2 5. g:e3 hg1 6. ef4 g:c5 7. cb4 cg1 8. bc5 d:b4 9. a:c5 g:b6 10. a:c5 fg5 11. cd6 g:e3 12. de7 f:d6 13. h:f2 x

№ 110 1. h2-g3 f2:h4 Маслов 2008г. 2. b6-c7 d8:d4 3. f6:d8 h4:f6 4. d8:h4 e3:g5 5. h4:e1+

№ 111 1. h2-g3 a5:e5 2. f4:f8 f2:h4 3. f8-d6 d8-e7 4. d6:f8 h4-g3 5. f8-c5 g3-h2 6. c5-g1+

№ 112 лег. 1...bc5 2. fg3 ce7 ісх. 1. c3-d4 a5:e5 2. f4:f8 h4:f2 3. h2-g3 f2:h4 4. f8-d6 d8-e7 5. d6:f8 h4-g3 6. f8-c5 g3-h2 7. c5-g1+

№ 113 1. e7-d8 c5:g5 2. h6:f4 a3:c5 3. e5-d6 g3:c7 4. d8:g1+

Першымі дакладныя адказы даслалі: В. Арцюхін, Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі, (усе — Мінск), С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru.

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

З нагоды

# БЕЛТЭЛЕРАДЫЁКАМПАНІЯ АДЗНАЧЫЦЬ ЮБІЛЕЙ!

**Сёлета 5 жніўня Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія Рэспублікі Беларусь адсвяткуе 30-годдзе з дня свайго стварэння. Але першыя пазыўныя Беларускага тэлебачання прагучалі 1 студзеня 1956 года, калі да аўдыторыі звярнулася Тамара Бастун: «Добры вечар, дарагія таварышы! Пачынаем нашы пробныя перадачы».**



У той дзень пачала вяшчанне першая ў БССР студыя тэлебачання, якая размяшчалася на вуліцы Камуністычная, 6 у Мінску. Спачатку вяшчанне доўжылася толькі 2-3 гадзіны ў суткі, але паступова аб'ём павялічваўся. Дарэчы, падрыхтоўкай і выхадам у эфір кіраваў Камітэт па радыёвяшчанні і тэлебачанні пры Савеце Міністраў БССР, створаны ў чэрвені 1957 года. Пасля, у 1970-я гады пачалося ўзвядзенне новага будынка тэлецэнтра ў Мінску на Макаёнка, 9. І 5 жніўня 1994 года на базе Дзяржаўнага камітэта па тэлебачанні і радыёвяшчанні стварылі Нацыянальную дзяржаўную тэлерадыёкампанію Рэспублікі Беларусь.

Пачынаючы толькі з аднаго цэнтральнага тэлеканала і праваднога радыё, Белтэлерадыёкампаніяператварылася ў буйны медыяхолдынг з уласнай вытворча-тэхнічнай базай. Сёння ў яго структуры 6 рэспубліканскіх тэлеканалаў, сярод якіх галоўны інфармацыйны канал краіны «Беларусь 1», пазнавальна-забаўляльны «Беларусь 2», сацыякультурны тэлеканал «Беларусь 3», «НТБ-Беларусь», спартыўны тэлеканал «Беларусь 5» і міжнародны спадарожнікавы «Беларусь 24», а яшчэ рэгіянальныя тэлеканалы (яны з 2015 года выходзяць пад агульнай назвай «Беларусь 4» і з указаннем вобласці).

Вельмі разнастайную і насычаную палітру з больш за 300 праграм можна знайсці і на 5 каналах Беларускага радыё, дзе значацца Першы нацыянальны канал Беларускага радыё, канал «Культура», радыёстанцыя «Сталіца», замежнае радыё «Беларусь» і радыёстанцыя «Радиус-FM». У прыватнасці, вяшчанне на замежную аўдыторыю (у больш за 100 краін) вядзецца з выкарыстаннем магутнасцяў і магчымасцяў тэлеканала «Беларусь 24» і Міжнароднага радыё «Беларусь».

Асаблівую каштоўнасць мае тэлерадыёфонд медыяхолдынгу, які ўяўляе сабой архіў аўдыявізуальных твораў, створаных за дзесяцігоддзі існавання тэлебачання і радыё ў нашай краіне. Аб'ёмамі толькі алічбаваных і адрэстаўраваных фондавых матэрыялаў можна забяспечыць кругласутачнае вяшчанне аднаго тэлеканала на перыяд у два гады. Архіў штомесячна папаўняецца новымі матэрыяламі, што дазваляе ствараць своеасаблівы эфірны летапіс Беларусі.

А вось у сетцы Інтэрнэт медыяхолдынг прадстаўлены афіцыйным сайтам www.tvr.by і сайтамі тэле- і радыёканалаў, спартыўным вэб-парталам www.sport5.by, дзясяткамі старонак у сацыяльных сетках і адзіным у краіне інтэрнэт-каналам «Беларусь 5. Інтэрнэт», які дае беларускім прыхільнікам спорту бясплатны online-доступ да відовішчных спартыўных трансляцый.

Яшчэ на афіцыйных YouTube-каналах Агенцтва тэлевізійных навін, тэлеканала «Беларусь 24» і радыё «Беларусь» публікуюцца матэрыялы на англійскай і польскай мовах, што дае магчымасць суседзям атрымліваць актуальную, аператыўную і даставерную інфармацыю.

Эфір тэлеканала Белтэлерадыёкампаніі — гэта арыгінальны кантэнт, рэйтынгавыя фарматы і вядомыя вядучыя. Праграмы арыентаваныя на шырокую аўдыторыю, заўсёды адметныя сваёй інфармацыйнай насычанасцю і жанравай разнастайнасцю. Да галоўных і гучных прэм'ер апошніх гадоў можна аднесці шоу «Фактар.by», «Героі», «100 пытанняў даросламу» і «Добры вечар», кожнае з якіх нязменна дэманструе высокія рэйтынгі тэлепрагляду. Застаюцца заўсёды любімымі аўдыторыяй і праекты-доўгажыхары: «Беларуская часінка», «Панарама», «Добрай раніцы, Беларусь!», «Тэлебарометр», «Калыханка». Вядома, вялікую ўвагу ўдзяляюць і інфармацыйна-аналітычнаму вяшчанню, і аўтарскай журналістыцы. Напрыклад, адным з падраздзяленняў медыяхолдынга з'яўляецца Агенцтва тэленавін, супрацоўнікі якога аператыўна асвятляюць падзеі ў краіне і ў свеце, ствараюць шэраг тэматычных праектаў, ток-шоу, рубрык, дакументальных цыклаў і тэлефільмаў. Убачыць гэты кантэнт тэлегледачы могуць у эфіры «Беларусь 1», «Беларусь 24» альбо на відэахостынгу YouTube. І, варта адзначыць, што рэгулярна, спецпраекты і расследаванні журналістаў Агенцтва тэленавін маюць вялікі рэзананс і знаходзяць водгук не толькі ў Беларусі, але і ў краінах блізкага замежжа.

У 2023 годзе Белтэлерадыёкампанія і Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» аб'явілі аб пашырэнні супрацоўніцтва ў рамках вытворчасці арыгінальнага тэлепрадукта. Медыяхолдынг мае таксама багаты вопыт арганізацыі і правядзення міжнародных песенных фестываляў і нацыянальных тэлевізійных конкурсаў: міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», нацыянальнага конкурсу «Тэлевяршыня», радыёконкурсу «Маладыя таленты Беларусі» і іншых. Летам 2019 года тэле- і радыёканалы холдынга транслiравалі ў прамым эфіры і шырока асвятлялі падзеі II Еўрапейскіх гульняў у Мінску, а ў 2023 годзе — спартыўныя мерапрыемствы II Гульняў краін СНД.

Штогод да новага вяшчальнага сезона, які стартуе восенню, усе тэле- і радыёканалы Белтэлерадыёкампаніі рыхтуюць серыю прэм'ер. Сезон 2024\2025 года не стане выключэннем. Будзем трымаць вас у курсе падзей.

**Алена ДРАПКО.**

**Фота Белтэлерадыёкампаніі.**

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 23.30** Зона Х (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.40** Навіны надвор'я.
**11.00, 12.15 Меладрама «Патрэбна нявеста з пражываннем» (12+).**
**13.05, 15.25 Меладрама «ЗАГС» (12+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**18.30** Маршрут пабудаваны (12+).
**19.20, 22.00 Серыял «След» (16+).**
**20.00** «100 пытанняў даросламу» (12+).
**21.00** Панарама.
**21.45** Зразумелая палітыка.
**23.00** Арэна.
**23.50** Дзень спорту.
**0.05 Меладрама «Хачу быць шчаслівай» (12+).**

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**10.00, 13.30, 21.05** Тэлебарометр.
**10.05 Дэтэктыў «Смерць на мове кветак» (16+).**
**14.00** Смачна есці (12+).
**14.45** «Іван Царэвіч і Шэры воўк-5» (6+).
**16.05** «Чорны спіс» (16+).
**16.45** «Дарагая, я забіў» (16+).
**17.55** «Знакі лёсу» (16+).
**18.25 Серыял «Ты мая маці?» (16+)**
**20.10 Серыял «Жукі» (16+).**
**21.10** Спартлато 6 з 49, КЕНА.
**21.15 Серыял «Атэль «Элеон» (16+).**
**22.15 Дэтэктыў «Сышчыца» (16+).**
**0.15** «Сям'я. Перазагрузка» (16+).

## Беларусь 3

**7.00** «Дабранак».
**7.35** «Беларуская кухня».
**8.05, 13.05, 20.30, 22.55** «Навіны культуры».
**8.15, 21.05 «Жукаў». Маст. фільм (16+).**
**10.05** «Генацыд. Без права на жыццё» (16+).
**10.20** «Архітэктура Беларусі».
**10.35, 15.30 «У пошуках капітана Гранта». Маст. фільм (12+).**
**11.45** «Нацыянальны хіт-парад».
**12.35** «Жывая спадчына».
**13.15 «Снежная каралева». Маст. фільм (6+).**
**14.40** «Наперад у мінулае».
**15.05** «Навука побач» (6+).
**16.40** «Кадры жыцця».
**17.30** «Славянскі базар у Віцебску».
**18.20** «Апошні дзень».
**19.00 «Хлопец з нашага горада». Маст. фільм (12+).**
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.05** «Суразмоўцы».
**23.20 «Да пабачэння, хлопцы». Маст. фільм (16+).**

## Беларусь 5

**6.55** Футбол. Чэмпіянат Расіі. ЦСКА (Масква) — ФК «Арэнбург».
**8.55** На спорце!
**9.15** Футбол. Чэмпіянат Бразіліі. Атлетыка «Паранаэнсэ» — «Грэміа».
**11.10** Як гэта было.
**11.40** Пляжны футбол. Чэмпіянат Беларусі.
**12.45** Футбол. Чэмпіянат Беларусі.
**13.30** Хакей. Кубак Беларусі. «Нёман» (Гродна) — «Шахцёр» (Салігорск).
**15.25** Пляжны футбол. Чэмпіянат Беларусі.
**16.50** Кубак па петанку.
**17.50** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Макслайн» (Віцебск) — «Лакаматыў» (Гомель). У перапынку — «Спорт-цэнтр».
**19.55** Футбол. Чэмпіянат Расіі. «Спартак» (Масква) — «Крылы Саветаў» (Самара). У перапынку — «Спорт-цэнтр».
**21.55** На мяжы фолу. Футбольны агляд.
**23.20** Змешаныя адзінаборствы.

## АНТ

**6.00, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.10** Наш час.
**10.15** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Белыя Росы» (12+).
**11.55** «Модны прыгавор» (6+).
**12.45, 13.15, 22.30 Фільм «За паўгадзіны да вясны» (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** Інфармацыйны канал (16+).
**20.10** Вячэрнія навіны.
**21.20 Фільм «Трэйдар» (16+).**
**0.30** «Спартклуб» (16+).
**0.50** Час.

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00** «Тыдзень».
**10.40** Дак. праект «Без падману» (16+).
**13.50, 0.50 «Вышук-3». Серыял (16+).**
**16.50 «Першы аддзел-2». Серыял (16+).**
**20.10, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.15** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.25** «Міншчына».
**20.40 «Аўтсайдар». Серыял (16+).**
**23.20** «Азаронак. Напрамую».

## МІР

**5.00, 6.25, 10.10 Тэлесерыял «Смерць шпіёнам» (16+).**
**6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 18.30** Навіны.
**6.15** «[Не]Фантастыка» (12+).
**13.15** «Міравое пагадненне» (16+).
**14.10** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15** «Справы судовыя. Яблык разладу» (16+).
**17.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**18.50** «Гульня ў кіно» (16+).
**21.35** «Мільён за 5 хвілін» (16+).
**22.20 Маст. фільм «Дзяўчына без адрасу» (16+).**
**0.15** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).
**2.45 Маст. фільм «Любімая дзяўчына» (16+).**
**4.10 Тэлесерыял «Смерць шпіёнам. Крым» (16+).**

## РТР—Беларусь

**6.00, 9.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00** Беларусь. Навіны.
**6.05, 9.05** «Новая раніца».
**10.05 Тэлесерыял «Рая ведае ўсё!» (12+)**
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Акцэнты».
**12.40** «Пра самае галоўнае» (12+).
**13.35, 18.40** Гумарыстычная праграма (16+).
**13.45** «Плюс-мінус».
**14.40** «60 хвілін».
**16.10 Тэлесерыял «Васіліса» (12+).**
**17.40** «Ёсць пытанне» з Вадзімам Гігіным.
**18.55** «Малахаў» (16+).
**21.30, 23.15 Тэлесерыял «Выпрабаванне. Новыя серыі» (12+).**
**1.25** «Петрасян-шоу» (16+).

## НТБ—Беларусь

**6.10** «Астрапрагноз».
**6.15** Беларусы (6+).
**6.50** «Навука побач» (6+).
**7.25** «Маршрут пабудаваны» (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.25, 10.35 Фільм «Кіроўца аўтобуса» (12+).**
**11.25 Фільм «Расклад на паслязаўтра» (12+).**
**13.20, 22.55, 23.45** Сёння. Галоўнае.
**13.25** «Надзвычайнае здарэнне».
**13.55 Серыял «Пёс» (16+).**
**16.40, 20.00** Галоўнае. Сёння. Беларусь.
**16.50** «Экспертыза злачынстваў» (16+).
**17.20, 20.15, 23.00, 0.00 Серыял «Неўскі. Праверка на трываласць» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 19.05** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05** Мультпарад.
**7.30** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35** «Любімае кіно».
**9.05** Мультпарад «Хрусталік і пінгвін».
**10.20 Серыял «Прафесія — рабаўнік» (16+).**
**12.00 Серыял «Мегрэ».**
**13.00 Драма «Пёрл Харбар» (16+).**
**16.00 Серыял «Сярод канібалаў» (16+).**
**17.30 Драма «Хто ж ты» (16+).**
**19.10** «Вячэрні серыял» (16+).
**20.50** «Вечарніца».
**21.00** «Надвор'е».
**21.05 Трылер «Ззянне» (18+).**
**23.25 Баявік «Паляўнічы на монстраў» (16+).**
**1.00** «Начны серыял».

## Культура

**6.30** Мультфільмы.
**7.55** «Асенняя ранішнікі». Маст. фільм.
**10.10** «Класная тэма!»
**10.40** Невядомыя маршруты Расіі.
**11.20** «Заліў шчасця». Маст. фільм.
**12.45** «Музеі без межаў».
**13.15, 2.15** Краіна птушак.
**13.55** «Выдатны раганосец». Маст. фільм.
**16.00** «Карціна свету» з Міхаілам Кавальчуком.
**16.40** «Я, Майя Плісецкая...». Дак. фільм.



**18.00** Балет «Ганна Карэніна».
**19.30** Навіны культуры.
**19.45** «Дождж у чужым горадзе». Маст. фільм.
**22.05** «Нам няма куды бегчы адзін ад аднаго...» Фільм.
**23.35** «Зорка чароўнага шчасця». Маст. фільм.

## Настальгія

**6.00** «Да і пасля...» (16+)
**6.45, 8.30, 9.40, 11.25, 13.45, 14.35, 17.30, 19.10, 21.40, 23.30, 0.35, 2.00, 3.40, 5.35** Музычная настальгія (12+).
**7.00** Маст. фільм «Поўнач. Сэрцу не загадаеш» (16+).
**9.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**11.00, 17.00, 23.00, 5.00** «Блеф-клуб» (16+).
